ХВЕДАР НЮНЬКА

# МАЕ ЎСПАМІНЫ

KAMUNIKAT.org

ВІЛЬНЮС 2000

**Хведар Нюнька**
Старшыня Таварыства Беларускай Культуры
ў Літве

**МАЕ ЎСПАМІНЫ**

Выдавецтва Jusida.
Вільня, 2000
300 экз.

KAMUNIKAT.org

# МАЕ ЎСПАМІНЫ

Не было ў мяне і думкі, каб пачаць пісаць дзённік аб перажытым. Але шматразовы напамін аб гэтым Сямёна Шарэцкага спрычыніўся да гэтага. Час ляціць хутка. Шмат падзей выпадае з памяці. Можа, каму-небудзь будзе цікава прачытаць, як прайшло маё жыццё. На жаль, цяпер думаю, чаму не высьветліў іншае прозьвішча, дату альбо падзею ў свайго бацькі, які меў выдатную памяць і ясную галаву да апошніх дзён свайго доўгага жыцця. Але яго ўжо няма. Няма ўжо нікога са старэйшых сваякоў з радні Нюнькаў альбо па мамінай лініі з Патапчыкаў. Так што нічога ўдакладніць не змагу, а запішу тое, што захавалася ў маёй памяці.

Нарадзіўся ў вёсцы Алешавічы Шчучынскага павету. Па адных дадзеных 5 сакавіка, па другіх - 6 красавіка 1928 году. Якая дата праўдзівая, сам не ведаю. У вёсцы я пражыў хіба з год. Бацькі пераехалі ў Масты, бо на вёсцы на двух гэктарах зямлі пражыць было цяжка. Бацька з братам Язэпам падраблялі на будоўлі вясковых хат, гумнаў, хлявоў і сталяркай: вокны, дзьверы. У Масты пераехаць, каб лепш жыць, параілі жыды. Там будавалася фанерная фабрыка, на якую ў Польшчы быў попыт, а значыць, і добрая перспектыва на будучыню. Уласьнік фабрыкі пан Канапацкі ствараў добрыя ўмовы для людзей, што перасяляліся ў Масты. Даваў бясплатна пляц пад забудову і ўсяляк падтрымліваў. Канешне, гэта было выгадна перш за ўсё яму - фабрыканту, каб мець дастаткова таннай рабочай сілы на фабрыцы. Атрымаўшы пляц недалёка ад фабрыкі, бацька мой разам з братам Язэпам за кароткі час пабудаваў дом і падсобныя хлеў са сьвірнам. Адзін большы пакой быў прызначаны пад краму. Цяпер трэба было знайсьці грошы, каб залажыць краму. Фабрыка разрасталася. Было шмат рабочых, што будуць купляць тавары, а значыць, і зарабіць можна будзе. Бацькі прадалі, што мелі, з пасагу, але грошай яшчэ не хапала, каб ехаць па тавар у Гародню ці Ліду. Грошай бацьку пазычыў “амэрыканец”. Так называлі тых, хто езьдзіў на заробкі ў Амэрыку.

Я памятаю, калі крама бацькоў ужо працавала. Па тавары бацька езьдзіў у Гародню на фурманцы. Адтуль спачатку прывозіў харчовыя тавары, цукар, соль, крупу, рыбу і другое. А потым прывозіў мануфактуру і галантэрыйныя тавары. Гандаль ішоў нядрэнна, нягледзячы на тое, што ў Мастах было ўжо некалькі жыдоўскіх і польскіх склепаў. Рабочыя шмат куплялі. Абарот быў дастатковы і бацька змог у дамоўлены час вярнуць “амэрыканцу” грошы, а крама набывала ўсё больш тавараў. Безумоўна, не ўсё было так проста. Патрабавалася шмат цяжкай

працы, бо ехаць па тавары трэба было ноччу, значыць, не спаць, эканоміць на чым толькі можна. Самі елі тыя прадукты, якіх ужо не раскупілі рабочыя. Але ж галоўнае было дасягнута: займелі сваю краму, пазьней зьявілісяі свабодныя грошы. Бацька купіў мотаровар "Закс", набылі радыё. Усё гэта ў той час было рэдкасьцю. Бацька мог ужо дазволіць сабе паехаць да Алешавіч на мапедзе, узяўшы з сабою бутэльку водкі, каб пачаставаць сялян. Людзі па-рознаму глядзелі: хто ганарыўся, што Якуб з іх вёскі разжыўся, мае ўжо жалезныя ложкі і езьдзіць на матацыклеце ды частуе. Бацька ўмеў з людзьмі падтрымліваць добрыя адносіны, людзі яго паважалі. Другія лічылі: а чым яны горшыя. Некаторыя папрадавалі гаспадаркі і таксама залажылі краму, але бальшыні з іх не ўдалося дабіцца посьпеху і, збанкрутаваўшы, вярталіся назад ні з чым.

Трэба адзначыць, што бацька быў вельмі слоўны: калі штосьці абяцаў, дык абавязкова выконваў. Меў аўтарытэт у гандляроў, яму верылі. Мог набраць тавараў, скажам, на тысячу злотых без аплаты і распісак, а сказаўшы, што праз нейкі час аплоціць, і не было ніколі ніякіх праблемаў ці непаразуменьняў.

Сталі жыць свабадней. Хіба ўжо гадоў пяць, як працуе крама. Сямья пачала запрашаць гасьцей. Амаль кожны тыдзень зьбіралася кампанія чалавек шэсьць-восем з пачастункам і бутэлькай. Тады выпівалі мала і на ўвесь вечар адной бутэлькі хапала.

З той пары прайшло шэсьдзесят пяць гадоў. Аднак мне так ясна ўсё ўспамінаецца, нават прозьвішчы Дэмбовскі, Фірэк, Штукоўскі, Дэрда, Астукевіч, Чучва сядзяць у галаве. Навошта гэта? Больш важныя рэчы забываюцца, а дробязь сядзіць.

Бацька Якуб меў больш левую арыентацыю, добра памятаў бежанства ў Расею ў 1915 годзе і добра ўспамінаў рускіх людзей, якія цёпла прымалі ў сябе і дапамагалі бежанцам-беларусам. Памятаў рэвалюцыйны пераварот 1917 года. На 1 траўня і другія камуністычныя сьвяты настаўляў радыё на Маскву і даваў слухаць рабочым. Некаторыя даносілі потым фабрыканту і паліцыі, але неяк спачатку праходзіла. Потым адносіны паміж бацькам і фабрыкантам пагоршыліся. Рабочыя плацілі не грашыма, а квіткамі, якія фабрыкант адмовіўся аплочваць. Былі і сямейныя праблемы. У 1935 годзе крама канчаткова збанкрутавала. А ў наступным годзе пераехалі ў Шчучын, дзе ўжо гадоў шэсьць жыў і меў сваю краму малодшы брат Язэп з сямьёю. Тут без цяжкасьцяў удалося знайсьці памяшканьне і адчыніць галантэрыйную і школьных прыладаў краму. Крамаў у горадзе было вельмі шмат. На 80 працэнтаў яны належалі жыдам. Нялёгка было вытрымаць канкурэнцыю, але ўменьне жыць з людзьмі дапамагло ўтрымацца і даволі пасьпяхова павесьці справу. Гэтаму спрыяла знаёмства з аптовымі фірмамі і іх давер у Беластоку, Варшаве і Гародні. У бацькі хапіла кемлівасьці, каб выстаяць і значна павялічыць абарот у краме. Магчыма, што працавітасьць і добрасумленнасьць з цягам часу змаглі б прынесьці значны капітал, калі б у 1939 годзе не пачалася вайна.

1 верасьня я прыйшоў у польскую школу (другіх не было) на заняткі, а настаўніца і кажа: "Будзем вучыцца, калі разаб`ем немцаў".

Па радыё з савецкага боку ішлі перадачы і музыка, што старэйшыя расцанілі як хуткае вызваленьне з панскага іга. Бацька часта слухаў радыё і рыхтаваўся сустрэць Чырвоную Армію. Дамовіўся з некаторымі жыдамі-гандлярамі, як з кветкамі і вянком будуць вітаць першыя часьці чырвонаармейцаў, што ўвойдуць у

Шчучын. Цераз колькі дзён пасля 17 верасьня сапраўды ў Шчучын уехала некалькі савецкіх танкаў. Бацька са мною, з кветкамі пайшоў на плошчу сустракаць. З тых, з кім ён дамовіўся прыйсьці на сустрэчу Чырвонай Арміі, ніхто не прыйшоў. Але іншых людзей паглядзець сабралася шмат. Бацька голасна выказаў прывітаньне, абняўся і расцалаваўся з прыбыўшымі чырвонаармейцамі. Мясцовыя палякі крыва глядзелі на ўсё гэта. Старэйшы, мабыць, камісар, прызначыў бацьку старшынём і даручыў яму абраць уладу ў горадзе. Камісар сказаў, каб пачалі працаваць усе службы ў горадзе, загадаў, каб адчынілі ўсе крамы. Хто чым займаўся, там і будзе працаваць. Мабыць, гандляры-жыды мелі большую інфармацыю, бо ні адзін крамы сваёй не адчыніў. Бацька ад пасады старшыні адмовіўся і сказаў, што мусіць адчыніць краму. На пытаньне ў камісара, як будзе цяпер з таварам, адкуль браць, той сказаў, што як усё было, так і будзе па-ранейшаму. Толькі пазьней мы зразумелі камуністычны падман. Камісар то ведаў, як будзе, што купцоў у лепшым выпадку павязуць да “белых мядзьведзяў”.

Крама была адчынена і чырвонаармейцы натоўпам накінуліся на польскія тавары. Там у іх у Саюзе нічога падобнага не было. На дабавак быў вывешаны чырвоны сьцяг. Салдаты бралі па-многу. Як раней было прынята ў Польшчы: хто бярэ больш тавару, то робіцца яму зніжка. Бацька радаваўся, што такога добрага гандлю ніколі не было. Не прайшло і тыдня, як з крамы нічога не засталося. Але ўсё гэта мо і на лепшае, бо не вывезьлі ў Сібір, хаця ярлык “эксплуататара”, нетрудавога элементу” застаўся.

Пачалося жыцьцё пры новай уладзе. У новай рускай школе я першы паступіў у піянеры. На савецкіх сьвятах выступаў з прамовай на трыбуне ад піянэрскай арганізацыі. Зламысьнікі пагражалі павесіць мяне на чырвоным гальштуку. У школе маімі лепшымі сябрамі былі вучні-жыды: Міша Марачынскі і Гары-Ісаак Сапір, лёс якіх далей склаўся трагічна. Хутка людзі, што чакалі вызваленьня і зьяднаньня з Усходняй Беларусьсю, зразумелі, што новая ўлада прынесла не вызваленьне, а збядненьне, насільле і бяспраўе. У крамах прапалі тавары першай неабходнасьці. За сольлю, запалкамі, цукрам ствараліся вялікія чэргі. Людзей масава арыштоўвалі, вывозілі і след ад іх прападаў. З добрай кватэры ў новым доме брата Язэпа нас выселілі і мы пераехалі жыць на краю горада ў адным пакоі 16 мэтраў квадратных разам з кухняй, дзе былі сырыя сцены. Мне тады ўсё гэта было яшчэ цяжка зразумець і я актыўна, з энтузыязмам выконваў піянэрскія абавязкі.

* * *

Пачатак вайны 1941 года я сустрэў у Алешавічах у дзеда, пасьвячы каня. Бачыў, як над Шчучынам, а гэта напрасткі якіх 8 кілямэтраў, стаяў дым ад пажараў. Немцы кінулі некалькі бомбаў на аэрадром, дзе стаялі вайсковыя самалёты. Нада мною праляцеў савецкі самалёт-зьнішчальнік. За ім гналіся тры нямецкія і абстрэльвалі з кулямётаў. Раптам савецкі рэзка пайшоў уніз і ўпаў. Нямецкі самалёт яшчэ пакруціўся раз і паляцеў далей. Савецкі лётчык вылез з самалёта, меў толькі разьбіты твар. Спытаўся ў людзей, дзе савецкае войска, а яно стаяла побач у маёнтку і пайшоў туды. Больш яго не бачылі.

У вёсцы тым часам вайскоўцы папярэдзілі жыхароў, што будуць узрываць снарады, якія былі ў складзе (лямусе), каб людзі ішлі ў лес, бо заставацца было

небясьпечна. Я быў адзін з канём за пару кілямэтраў ад вёскі. Мне было бачна, як гарэў маёнтак, а потым пачалі ўзрывацца снарады. Асколкі ляцелі ва ўсе бакі. Ляцелі нада мною. Гэта працягвалася некалькі гадзін. Ад гарачых асколкаў загарэлася вёска і амаль уся згарэла. Людзі былі ў лесе, а калі вярнуліся, то знайшлі толькі папялішча. Згарэла і наша хата і ўсё, што там было. А салдаты падпалілі склады ды падаліся на Усход. Больш іх ніхто не бачыў. З Алешавіч я дабраўся да вёскі Крышылкі, дзе жыў дзед па мамінай лініі і куды са Шчучына на час баёў пераехала ўся наша сямья. Цераз пару дзён паявіліся немцы. Яны ехалі на раварах, некаторыя на матацыклях з прычэпам. Трое заехалі на наш двор і з хлява выцягнулі цялушку, каб зарэзаць на мяса. Я са школы ведаў трошкі па-нямецку і пайшоў прасіць, каб яны замест цялушкі ўзялі бычка. Яго зарэзалі тут-жа. Усё мяса пагрузілі ў прычэп і ад`ехалі. Больш немцы туды не прыязджалі. Пражылі мы ў Крышылках з тыдзень і вярнуліся назад у Шчучын. Тут цывільная ўлада ўся была ў палякаў: гэта і паліцыя, і перакладчыкі, і адміністрацыя. Нямецкая камэндатура растрэльвала людзей, на якіх даносілі, што яны былі камуністамі альбо супрацоўнічалі з імі. Загінула шмат нявінных людзей. Я з бацькам і дзядзькам Язэпам паехалі ў Алешавічы адбудоўваць хату, што згарэла. Законнага шляху атрымаць лес не было. Ноччу езьдзілі ў лес, пілавалі і прывозілі на двор. Было небясьпечна. Аднойчы прыехалі паліцыянты з Каменкі і ўзялі чалавека, што краў лес, і павялі за вёску. Адтуль раптам пачуліся выстралы. Бабы пачалі енчыць, што яго забілі, але дзякаваць Богу, яны толькі папалохалі, а чалавек вярнуўся жывым і здаровым.

Хутка і мы на свой дом навезьлі матэрыялу і бацька з дзядзькам спрытна часалі брусы на сьцены, а я памагаў зьдзіраць кару. Работа была знаёмая. Бацька да гэтага пабудаваў не адзін дом. Да восені дом пабудавалі і можна было жыць. Паступова ўся вёска адбудавалася і жыцьцё пайшло сваім чарадом.

У Шчучыне немцы ўсё больш пачалі прыцясьняць жыдоў. Забаранілі хадзіць па тратуарах, абязалі насіць шасьцікутныя жоўтыя зоркі на плячах і грудзях. Іх ганялі на работу іх мясцовыя паліцыянты-падонкі без сумленьня і маралі. Яны зьдзекаваліся над імі і білі. Пазьней са Шчучына і навакольных месцаў загналі жыдоў у гета, адкуль яны не мелі права выходзіць без дазволу. Мне было іх вельмі шкада, таму што большасьць маіх сяброў былі жыды і я нават мог трохі гаварыць па-жыдоўску. На жаль, ім нельга было нічым дапамагчы. Фашыстоўскія законы былі вельмі жорсткія. За малейшую правіну - растрэл. Фашыстоўская сістэма, як і камуністычная, была скіравана на ліквідацыю людзей, што супярэчылі іх афіцыйнай ідэалёгіі: у адных расавай, а ў другіх - клясавай. У абодвух лік загубленых нявінных ахвяраў вымяраўся на мільёны. Сьмяротныя прысуды выносіліся таксама за парушэньне загадаў адміністрацыі, за раскраданьне жыдоўскай маёмасьці, за ўкрываньне ваеннапалонных, жыдоў і цыганоў, за хабар.

Назаўсёды запамяталася сцэна пакараньня маладых хлопцаў. У адной вёсцы цераз вакно хтосьці застрэліў солтыса. Немцы з паліцыянтамі злавілі шэсьць падазроных і прывезьлі ў Шчучын. Па горадзе былі разьвешаны аб`явы, што на галоўным пляцы будуць павешаны бандыты. Сабраліся амаль усе жыхары. Хлопцаў зусім маладых, моцна пабітых, падвялі да вісельняў і зачыталі прысуд. Двух з шасьці, як малалетніх, пакінулі глядзець, як будуць вешаць іх сяброў. На рыштаваньнях, што былі ўжо падрыхтаваны, адзін з хлопцаў крыкнуў: “Панове, мы невінны!” Але прагучала каманда і рыштаваньне рухнула. Пачуўся жахлівы выкрык

усіх людзей. Абарвалося жыцьцё маладых хлопцаў. Трупы забраць дазволілі родным толькі цераз тры дні. Жах ад убачанага застаўся на ўсё жыцьцё.

Бацьку некалькі разоў забіралі ў камэндатуру, але неяк выйшаў жывым. На допыце мясцовы службовец немцу сказаў, што бацька, калі наступала Чырвоная Армія, парваў польскі сьцяг, але, мабыць, гэтага было недастаткова, каб растраляць. Другі раз маці занесла хабар бурмістру і зноў яго выратавалі.

Хоць і вельмі складаны быў час, але ж трэба было неяк жыць: сеяць хлеб, харчавацца, рыхтаваць дровы, апранацца. Паволі людзі пачалі прыстасоўвацца да цяжкіх ваенных умоваў. Бацька меў вопыт у гандлі, таму заняўся тым, што купляў і прадаваў нейкія тавары, што прывозілі з Ліды і Гародні, з гэтага і трымаліся.

З часам атрымалі дазвол адкрыць краму ў тым самым месцы, дзе была да вайны. У горадзе ўжо існавала больш за дзесяць крамаў. Тавар людзі прывозілі з Ліды, Вільні, Гародні і з Польшчы. Часьцей гэтым займаліся тыя, хто зьвязаны быў з працай на чыгунцы.

Памятаю, што шмат прадавалі дрожджаў, якія людзі куплялі на выраб самагону. Самагон гналі як на вёсках, так і ў горадзе ў вялікіх колькасьцях, бо казённай водкі не было. У Лідзе выраблялі піва, але яно прызначалася толькі немцам.

Побач з бацькавай дзейнічала крама майго дзядзькі, мамінага брата, Патапчыка Юльяна. Ён, нягледзячы, што меў шэсьць дзяцей, рызыкуючы жыцьцём усіх, меў сувязь з савецкімі партызанамі - забясьпечваў партызан мясам. Мая радня пра гэта ведала. Пасьля вайны Юльян Патапчык быў узнагароджаны і пражыў звыш 80 гадоў.

Пачала працаваць польская сярэдняя школа, дзе выкладалі ранейшыя настаўнікі, у асноўным прыехаўшыя з Цэнтральнай Польшчы. Правучыліся год. У наступным навучальным годзе школа цалкам перайшла на беларускую мову. Часткова з мясцовых, а часткова з прыезджых нацыянальна сьведамых настаўнікаў быў сфармаваны выкладчыцкі калектыў. Незадаволенасьці або пратэсту з боку бацькоў ніколі не было. Апрача мясцовых, прыехала вучыцца шмат дзяцей з навакольных вёсак. Школа была ўкамплектавана. З настаўнікаў асабліва запамяталіся Агіцкі, Станкевіч, бацька і сын Клышэвічы, Беразоўскі, Гарбацэвіч. Акрамя ведаў па асноўных прадметах, школа знаёміла нас з гісторыяй і культурай Беларусі. Ставіліся пастаноўкі беларускіх драматургаў. Вельмі актыўна і цікава вёў працу студэнт-энтузіяст з Варшавы Пётр Рандарэвіч. Гэтыя людзі жылі ў цяжкіх матэрыяльных умовах варожай акупацыі, але ўпершыню яны маглі свабодна карыстацца і выкладаць на сваёй роднай мове. Адбыўся моцны патрыятычны ўздым беларусаў. Падобнага больш я не памятаю. Школа стала кузьняй патрыётаў Бацькаўшчыны. Я ўпершыню тут зразумеў, што зьяўляюся беларусам. Родная мова не польская, якой я дагэтуль карыстаўся, а беларуская. Я ўступіў у Беларускую Самапомач.

Мала хто тады ведаў нямецкую мову, а гэта патрэбна было, каб абараніць сябе ці памагчы людзям у бядзе. Палякі, што валодалі мовай, нярэдка выкарыстоўвалі гэта супраць беларусаў. Была створана група дзяцей па вывучэньню нямецкай мовы, якой кіраваў пан Імеля, што прыехаў перад вайной з-пад Варшавы. З усёй групы да канца дайшоў я адзін, але мог ужо даволі свабодна размаўляць. Пазьней мне гэта вельмі дапамагло. Аднойчы немцы забралі ў нас карову і я з маці пайшоў прасіць да гаспадарчага кіраўніка раёну Эрмана. І,

дзякуючы веданьню мовы, удалося вярнуць карову. Другі раз, калі ў горадзе стаяла карная нямецкая камендатура і сваёй жорсткасьцю вельмі палохала людзей: шмат тады растрэльвалі. Па даносе арыштавалі і бацьку, дзядзьку Язэпа і яшчэ аднаго беларуса, прозвішча якога не памятаю, затое, што яны быццам камуністы. А гэта растрэл. Я пайшоў у камендатуру і стаў прасіць. Іх не толькі не растралялі, але і не білі. Пазьней шмат каму аказваў дапамогу. Некалькі месяцаў працаваў перакладчыкам у Эрмана.

Тым часам падзеі пайшлі ў другім напрамку. Акрамя савецкіх партызан, паявіліся польскія, якія не толькі змагаліся з немцамі, але пачалі масава забіваць прадстаўнікоў беларускай інтэлігенцыі - работнікаў культуры, настаўнікаў, актыўных патрыётаў. Так былі па-зверску забітыя: Пётр Рандарэвіч, дырэктар школы Беразоўскі, Станкевіч, Язэп і Юры Клышэвічы, Павел Шляхтун, бацюшка і матушка Аляхновічы, Юльян Саковіч, Васюк і шмат-шмат іншых. Так быў зьліквідаваны цьвет нацыі раёна. Няведама, хто больш павінен у гэтых злачынствах: чырвоныя ці белыя. Патрэбна даследаваньне гэтых злачынстваў. Я асабіста ведаў бальшыню гэтых беларусаў і магу перад людзьмі і Богам за іх паручыцца, што яны ні ў чым не былі вінаватыя. Адзінае ясна, што забівалі іх за тое, што яны былі бескарысна адданыя служэньню сваёй Бацькаўшчыне-Беларусі, за што і прынялі пакутніцкую сьмерць. Вечная ім памяць! А нашчадкі нашы, калі стане Беларусь свабоднай і незалежнай, павінны належным чынам ушанаваць іх памяць.

Па зьвестках, што паходзілі ад знаёмых вясковых людзей, даведаліся, што зьбіраюцца забіць майго бацьку, які хоць не быў ніколі камуністам, але меў левыя погляды і дапамагаў беларусам. Беларускія актывісты часта наведвалі наш дом, а некаторыя і жылі часова. Трэба было хутка вырашацца, што рабіць. Хацелі пераехаць у Гародню, бо яна бліжэй і больш знаёмая, але Гародня была ў межах рэйха, таму лягчэй было пераехаць у Вільню. Я, маючы 15 гадоў, паехаў у Ліду да гебітс-камісарыяту, каб атрымаць дазвол. Такі дазвол я атрымаў і ў канцы 1943 года ў таварным вагоне ўся сямья пераехала ў Вільню. Спачатку мы змаглі пасяліцца толькі ў Новай Вільні па вуліцы Жвірблю. Было цяжка - не было грошай, так што жылі амаль упрогаладзь. Немцы хацелі ўсю сямью адправіць у Нямеччыну як бежанцаў з Расеі. Далі ўжо павестку ў Новай Вільні, але зноў дапамагло веданьне нямецкай мовы і нас пакінулі. Пазьней мова яшчэ не раз спатрэбілася і дапамагла.

Паступова жыцьцё наладжвалася. Бацька ўладкаваўся на працу на тартак, дзе апрацоўвалі лес. А праз паўгода пераехалі ў Вільню. Праблемаў з кватэрай не было. Пасяліліся на вуліцы Завальнай. На рынках ішоў бойкі гандаль усім, што хочаш. Наогул, трэба сказаць, што тут рэжым не быў такі суровы, як на Беларусі. Там за знойдзеныя дэталі зброі альбо радыё растрэльвалі, а тут можна было слухаць радыё, езьдзіць на матацыкле, свабодна хадзіць па горадзе. У Вільні была магчымасьць агледзець беларускую і рускую гімназію, сустракацца з беларусамі-патрыётамі. Гэта звычайна было па сьвятах на тэрыторыі Свята-Духавага манастыра. Зьдзейсьнілася магчымасьць пабачыць у касьцёле Святога Міхала ксяндза Адама Станкевіча - беларускага апостала, якога пазьней зьліквідаваў камуністычны рэжым.

Вайна падыходзіла да лягічнага завяршэньня. Фашыстоўскі антычалавечны рэжым скончаў сваё існаваньне пад напорам дэмакратычных альянцкіх сілаў

Заходу і Савецкага Саюзу. Адным дыктатарскім рэжымам станавілася на зямлі менш.

Амаль уся Вільня апусьцела. Цэлыя кварталы былі бязлюднымі. Хто адступаў з немцамі, каб не жыць у Саветаў, хто выехаў на вёскі за Вільняй. Мы не мелі куды ехаць і асталіся адны на некалькі дамоў. Пражылі ў цэнтры горада і адступленьне немцаў і прыход рускіх. Усе бамбёжкі і вулічныя баі былі на віду і слыху. З другога паверху, дзе мы жылі, я бачыў, як з Менску адыходзілі курсанты Беларускай афіцэрскай школы - нашы патрыёты, якія перанесьлі любоў да Беларусі пасьля праз усё жыцьцё, жывучы на чужыне. Многія з іх у далейшым ваявалі супраць немцаў у саюзнікаў, у тым ліку і пад Монтэ-Касына (Італія).

Першага рускага салдата я ўбачыў, ён крыкнуў: “Гардзей, падай пулямёт”. Рэдкія людзі, што асталіся ў горадзе, віталі апаленых вайною салдат і частавалі гарэлкай. 13 ліпеня 1944 года Вільня была вызвалена ад немцаў. На вуліцах ляжала шмат забітых салдатаў і афіцэраў, немцаў і рускіх. Шмат разбітай і спаленай тэхнікі. Кругом бітая чарапіца з дахаў. Дагаралі дамы, бо не было каму тушыць. Найбольшая бамбёжка была, калі занялі рускія, а немцы бамбілі таварную станцыю, што знаходзілася недалёка ад нас. Ноччу сьвяцілі ракеты і кідалі тонныя бомбы. Доўжылася гэта хіба з дзьве гадзіны. Тады больш за ўсё пацярпелі і людзі і горад. Старатэгічныя абьекты ў горадзе немцы ўзрывалі перад адступленьнем. Па ацэнках было знішчана 30 працэнтаў горада Вільні. Больш дэталёва не мае сэнсу апісваць. Усё гэта дастакова паказвалася ў фільмах, але мне забыць гэты жах і страх немагчыма.

Новы навучальны год пачаўся ў рускай гімназіі па вуліцы Нямецкай № 9. Выкладалі ў бальшыні былыя настаўнікі гэтай гімназіі, якія працавалі тут і ў вайну. Дырэктарам быў прызначаны Сакалоў са старых мясцовых інтэлігентаў, Але паступова іх замянялі прыезджыя з Усходу. Дырэктара, мабыць, арыштавала НКВД, бо ўсякі след аб ім згінуў. Час яшчэ быў ваенны. Шмат дзе валялася вайсковай амуніцыі. На перапынках некаторыя бегалі на другі бок вуліцы ў разваліны дамоў і там стралялі і кідалі дымавыя шашкі. Побач гімназіі была нямецкая кірха, у якой стаяў дарагі арган. Дык яго “раскулачылі” і выбралі, што толькі было магчыма. Але паволі парадак і дысцыпліна наладжваліся. Гімназію перавялі на праспэкт Гедыміна (тады Сталіна). Школу разьдзялілі на мужчынскую № 4 і жаночую № 6. Пазьней гімназію №4 назвалі імем Івана Чарняхоўскага, як і плошчу, на якой ён быў пахаваны. Гімназія стала тыпова савецкай школай, хаця вучыліся тут дзеці вышэйшай партыйнай эліты Літвы, у тым ліку і сын савецкага ідэёляга Суслава. Сам Суслаў нейкі час працаваў у Вільні ў партыйным апараце. Узровень навучаньня быў дастаткова высокім і многія яе вучні дасягнулі немалых посьпехаў, скончыўшы ВНУ і разьехаўшыся па тэрыторыі ўсяго Саюза. Шмат хто з іх выехаў пазьней жыць на Радзіму ў Ізраіль.

Цяпер ад будынкаў былых гімназій і помніка І. Чарняхоўскаму не засталося і сьледу. На іх месцы пабудаваны Дом Ураду, а сама плошча названа Савівальдзібес айкште.

Я сярод выдатнікаў вучобы не лічыўся. Па матэматыцы меў “тры”. Праўда, настаўнік матэматыкі Вульф Абелевіч Клябанскі быў вельмі патрабавальны і яго “тройка” ў другой школе магла раўняцца “чацьвёрцы” ці нават “пяцёрцы”. У гімназіі блізкія сяброўскія адносіны былі з Яшам Кірушчанкам і Віктарам Ермаковічам. У камсамол я не ўступіў. Погляды мае ўжо сфармаваліся рэзка адмоўна да

камунізму. На гэта паўплывалі заходнія сродкі масавай інфармацыі і параўнаньне таго, што гаварылася і што на самай справе рабілася ўСССР.

У 1948 годзе скончыў гімназію і вырашыў паступіць на лясны факультэт Віленскага дзяржаўнага універсітэта, бо лічыў, што вучыцца ў тэхнічнай вышэйшай навучальнай установе мне будзе цяжка. Праблемы з паступленьнем на лясны факультэт не было. Сюды ж паступілі і другія абсэльвенты нашай гімназіі: Я. Кірушчанка, А. Ваяводскі, В. Ермаковіч, П. Трыфанаў і А. Хацяновіч.

З 1949 году лясны факультэт далучылі да Літоўскай сельскагаспадарчай акадэміі ў Коўне і прыйшлося туды ехаць. Можна было перайсьці на другі факультэт і застацца ўВільні, але я не захацеў.

У Коўне шукалі кватэру, дзе будзем жыць. Прыпадкова сустрэлі маладую жанчыну, якая запрапанавала нам наняць шыкоўныя апартамэнты з трох умэбляваных пакояў. Гэтая кватэра належала брату балетмайстэра тэатру і оперы Ф. Келбаўскаусу, які за афёры патрапіў у турму на некалькі гадоў. Гэта была для нас удача. А жанчына была жонкай Эдварда Келбаўскауса - гаспадара дому і вельмі добрага чалавека.

На жаль, пазьней паміж Ваяводскім і гаспадыняй, якую звалі Рэгінай, і была яна нашмат маладзейшай за мужа Эдварда, усталяваліся блізкія кантакты, залішне блізкія. Муж пра гэта даведаўся і Ваяводскаму прыйшлося шукаць другую кватэру. Я застаўся адзін у трох пакоях і пражыў пару гадоў, пакуль не вярнуўся гаспадар з вязьніцы. Але пакуль жыў А. Ваяводскі, гаспадыня Рэгіна часта рабіла прыемныя сюрпрызы - на нашым стале, як у казцы знаходзілі смачныя патравы. Без Ваяводскага больш сюрпрызаў не было. Ну што ж, і так бывае. Трэба адзначыць, што А. Ваяводскі, акрамя сімпатычнай зьнешнасьці, быў, як кажуць, майстра на ўсе рукі: і музыкант, і сьпявак, і спартсмэн, і галантны кавалер. Слабасьць меў да водкі. Калі паяўлялася дома бутэлька, то іншай размовы не было, каб толькі яе расьпіць. Гэта яму перашкаджала, каб чаго-небудзь дабіцца. Кінуўшы тут у Вільні жонку, выехаў у Сяміпалацінск, там ажаніўся, займеў дзесяць дзяцей і памёр убеднасьці.

Вучыцца на лясным факультэце было лёгка. Выкладчыкі ў большасьці карысталіся падручнікамі на рускай мове, перакладаючы іх на літоўскую мову. Я рыхтаваўся да экзаменаў і залікаў па арыгіналах - рускіх падручніках і здаваў усё на рускай мове. Дарэчы сказаць, здаваў усё пасьпяхова: на чатыры і пяць. Але, каб больш акуратна хадзіў на лекцыі, дык лепш авалодаў бы літоўскай мовай, а так і цяпер адчуваю з ёй прабелы. Шмат лекцыяў прапускаў, каб быць больш у Вільні, дзе былі мае сябры А. Анцукевіч , І. Багдановіч, С. Кокаш і Л. Кірковіч. Тут жыла мая сымпатыя Тамара Чаркасава - студэнтка медыцыны. На жаль, я не карыстаўся яе ўзаемнай сімпатыяй, таму мае заляцаньні былі беспасьпяховымі.

У Вільню ў летні перыяд езьдзіў на матацыкле Іж-350. Зімою езьдзіў цягнікам. Права язды атрымаў у 1947 годзе. За перыяд вучобы ў Літоўскай сельскагаспадарчай акадэміі запамяталіся выдатныя прафэсары і цікавыя людзі: Тадас Іванаўскас - брат Вацлава Іваноўскага і прафэсар Мастаўскіс.

У 1949 атрымаў права на кіраваньне аўтамашынай. Не пакідаючы вучобы, уладкаваўся шафёрам на машыну “Віліс” ва ўездным фінансавым аддзеле. Пазьней у Коўне працаваў на “Пабедзе” ў настаўніка ЛСГА Навардайціса. Езьдзіў машынай на заробкі і частку грошай аддаваў Навардайцісу - такая была дамова.

Коўна як горад мне падабаўся - багаты, чысты, эўрапейскі. Ніхто там мяне

не пакрыўдзіў, не прыніжаў. Аднак, адчуваў там сябе госьцем і заўсёды цягнула ў Вільню. Так праляцела чатыры гады маёй навукі ў Коўне. Не знайшоў там сабе ні сапраўднай сымпатыі, ні каханай. Калі гавораць, што студэнцкія гады самыя радасныя, запамінальныя, дык я гэтага не магу сказаць. Нярэдка чамусьці настрой быў спахмурны, не адчуваў радасьці жыцьця.

У 1953 годзе на выдатна абараніў дыплём інжынера і атрымаў накіраваньне ў Дзяржплян рэспублікі. З усяго курса гэта было адзінае накіраваньне ў Вільню. Можна было радавацца - мне, беспартыйнаму, адкрывалася добрая кар`ера, лёгкае атрыманьне кватэры. Але мяне больш цягнула не канторская праца, а паездкі, камандзіроўкі па рэспубліцы. Я ўладкаваўся інжынерам у хімлясгас, дзе былі пастаянныя камандзіроўкі і някепскія заробкі. На жаль, гэтым я загубіў правы маладога спецыяліста, бо дакумэнты засталіся ўДзяржпляне і мне іх не вярнулі.

Працуючы некаторы час шафёрам у Вільні і Коўне, маючы добрыя заробкі ў хімлясгасе, сабраў грошы, каб купіць машыну, што зьдзейсьнілася ў 1954 годзе. Аўтамашын у той час было вельмі мала. Былі, канешне, багатыя людзі, якія лёгка маглі купіць што заўгодна. Але яны баяліся паказаць свае незаконныя даходы. Я быў шчасьлівы, сеўшы ў новенькую “Пабеду”. Ніколі не забуду гэтай радасьці. Потым былі другія машыны, але нічога падобнага больш не адчуў.

З будучай жонкай Нінай Кацары я быў знаёмы яшчэ з гімназіі. Некалькі разоў былі разам на моладзевых вечарах. Былі, канешне, і другія знаёмыя дзяўчаты, але, мабыць, лёсам наканавана бліжэй пасябраваць менавіта з Нінай. Мне было 26 гадоў, настала пара падумаць аб сямы. Летам 1954 года з усёй сямьёй і з Нінай мы паехалі на Рыжскае ўзмор`е да маміных сваякоў з Ленінграда, якія там адпачывалі. Час, праведзены там, пакінуў незабыўныя ўражаньні на ўсё жыцьцё. Мы сталі мужам і жонкаю. Разам пражылі 46 гадоў. Я ўдзячны лёсу, што сустрэў такога чалавека, які зрабіў маё жыцьцё бязьмерна шчасьлівым. Для мяне гэта была ідэальная жанчына, жонка і маці. Мабыць, мае апошнія словы будуць: “Да сьвяціцца імя тваё, Нінок!”. Засталося двое дзяцей: Хведар (1955г.н.) і Ніна (1965г.н.).

Праца ў хімлясгасе добра ладзілася. Праблема была з кватэрай. Жылі мы асобна: я ў сваіх бацькоў, Ніна - ў сваіх. Наша кантора будавала дом. Я ўдзельнічаў пры будоўлі, спадзяваўся атрымаць там кватэру, але партыйны сакратар не падтрымаў маю кандыдатуру і мне адмовілі. Прыйшлося звольніцца з працы і пераехаць за горад у Яшуны на пасаду лясьнічага. Так вырашылася пытаньне з кватэрай. Праца мне была новай, але цікавай: 4 тысячы гектараў лесу, 17 лясьнікоў, асобны дом і гаспадарчыя забудовы. Пачаў энергічна наладжваць дысцыпліну. Ранейшы лясьнічы шмат піў і было ўсё запушчана. Не было для каня ні сена, ні саломы. Лясьнікі не выконвалі сваіх абавязкаў. Прыйшлося большую іх палову замяніць, падняць дысцыпліну. Так што восеньню нарыхтавана сена і саломы больш, чым трэба. Зьменшылася колькасьць самавольных парубак. Наладзіліся добрыя адносіны з раённымі ўладамі. На жаль, не абышлося без памылак. На работу конюхам прыняў несумленнага чалавека з суседняй вёскі, які, як высьветлілася, краў корм і вывозіў у сваю вёску, за што быў звольнены. Каб адпомсьціць, ён напісаў скаргу ў міністэрства. Была прызначана камісія, якая два тыдні правярала ўсю маю дзейнасьць. Былі выяўлены парушэньні, праўда, неістотныя. Трэба было пайсьці да міністра, папрасіць, усё патлумачыць, але я гэтага не зрабіў. Загадам міністра я быў звольнены з працы. Шмат гадоў пазьней я

стаў суседам гэтага міністра ў калектыўным садзе. Перш, чым даць згоду на маю прысутнасьць, міністр падняў увесь матэрыял рэвізыі і прызнаў, што ён паступіў няправільна са мною. Мы засталіся сябрамі.

У 1957 годзе вярнуўся ў горад. Не адразу ўладкаваўся на працу ў кантору "Лесахімік". У Вільні пачаў будаваць свой дом. Пляц пад будову я атрымаў раней. Дзякуючы эканоміі сямейнага бюджэту, продажу аўтамашыны і ўласнай працы, цераз год можна было частку дома засяліць. Гэта была вялікая перамога і агульная радасьць. Сына Хведара самаахвярна даглядалі маці і цёця Ніны. Дзякуй ім за гэта. З 1959 года памяняў спецыяльнасьць лясьніка на будаўніка. Без цяжкасьцяў завочна атрымаў дыплём тэхніка-будаўніка. Спачатку працаваў тэхнікам, затым інжынерам, галоўным інжынерам, і апошнія 25 гадоў - галоўным спэцыялістам каштарысаў у праектных інстытутах. Агулам адпрацаваў у праектных інстытутах, часта адначасова ў двух, 32 гады. Усе гады ўспамінаю з прыемнасьцю. Звычайна на працу ў цэнтры гораду (3 кілямэтры) хадзіў пехатою, часамі і з працы. Усюды была добрая, здаровая атмасфэра. Я ніколі не падвёў заказчыкаў з тэрмінамі выкананьня працы, не меў абгрунтаваных рэклямацый. За гэта з боку кіраўнікоў меў добрыя адносіны, поўнае разуменьне і пашану. Зарплату атрымоўваў высокую. Апошнія гады, дзякуючы акорднай аплаце, месячныя аклады складалі да адной тысячы і больш рублёў. Гэта, калі 1 кілаграм мяса каштаваў 2 рублі. Матэрыяльны дастатак дазволіў ажыцьцявіць нам з Нінай 17 турыстычных падарожжаў, што склала больш за 100 тысяч кілямэтраў па ўсяму Саюзу і за мяжу. Турызм заўсёды быў маім хобі. Ад падарожжаў засталося вельмі шмат відэа і фотаздымкаў.

* * *

З 1992 году выйшаў на пэнсію і прысьвяціў свой час грамадскай працы ў Таварыстве Беларускай Культуры. Пачалося ўсё з таго, што ў 1988 годзе Юры Зімніцкі, добра знаёмы беларус, таксама лясны інжынер, сказаў, што ў Палацы прафсаюзаў адбудзецца вечар сустрэчы і канцэрт гасьцей з Менску. Я пайшоў на вечар і быў захоплены песьнямі Сяргея Сокалава-Воюша і выступленьнямі Вінцука Вячоркі і другіх гасьцей. Значкі "Пагоні" і бел-чырвона-белыя сьцяжкі ў гасьцей вярнулі мне ў памяці ўсё перажытае: і тыя трагічныя, але гераічныя мінулыя часы 1942-44 гадоў. Я актыўна далучыўся да працы ў клюбе "Сябрына", якім кіраваў Валянцін Стэх. У Літве тым часам ішло актыўнае змаганьне супраць падпарадкаваньня Маскве, за свабоду і незалежнасьць Літвы. Яркім лідарам на шматтысячных мітынгах быў Вітаўтас Ландзбергіс. У Літве адбыўся раскол паміж літоўскімі камуністамі. Бальшыня іх выказалася за выхад з КПСС і падтрымку незалежніцкага руху. Прыезд Міхаіла Гарбачова ў Вільню не дапамог утрымаць Літву ў Саюзе. Падтрымку літоўскаму руху за незалежнасьць аказаў сакратар ЦК КПСС Аляксандр Якаўлеў у сваім выступленьні ў Акадэміі навук Літвы.

Клюб "Сябрына" праводзіў цікавыя сустрэчы ў Палацы прафсаюзаў. Прыязджалі з Беларусі артысты, літаратары, палітыкі. Ладзіліся імпрэзы памятных дат і юбілеі нацыянальных дзеячоў. Арганізаваны былі радыё і тэлеперадачы на літоўскіх каналах. На жаль, паступова актыўнасьць працы клюбу падала. Людзей прыходзіла ўсё меней. Па ініцыятыве і пры актыўным удзеле Лявона Луцкевіча 4 лютага 1989 году быў праведзены ўстаноўчы сход Таварыства Беларускай

Культуры, які прайшоў у залі музычнай школы імя Чурлёніса. Сабралася больш за 200 чалавек. Шмат гасьцей з Беларусі, у тым ліку і “Беларуськіно”. Афіцыйны Менск прыслаў савецкі сьцяг, які, канешне, мы выкінулі, бо кругом віселі бел-чырвона-белыя і герб “Пагоня”. Устаноўчы сход прайшоў пасьпяхова. Выступалі Лявон Луцкевіч, Галіна Войцік, Аляксей Анішчык, Антаніна Хатэнка і другія. Абрана была Рада ТБК з 7 асоб. Мяне прызначылі старшынём. Я адмаўляўся, бо арганізацыйнай справай ніколі не займаўся. Але сказалі, што нікога больш няма, хто б адпавядаў. Таму мяне ўгаварылі, каб я часова папрацаваў. І я пагадзіўся. Фінансавых сродкаў ТБК не мела. Тэлефонная сувязь, друкарскія работы пакрываліся за кошт інстытута, у якім я працаваў. Расходы на сустрэчы і прыёмы гасьцей, паездкі на Беларусь, паштовыя расходы пакрываліся са сваёй кішэні, балазе зарплаты на ўсё хапала. Пляны працы абмяркоўваліся на Радзе, якая зьбіралася пару разоў на месяц.

Першай сваёй справай хацеў ушанаваць памяць забітага ў 1944 годзе ў Вільні беларускага патрыёта-драматурга Францішка Аляхновіча. Неяк удалося дастаць дазвол на перазахаваньне астанкаў са зьліквідаванага лютаранскага могільніка на вуліцы Каліноўскага на могілкі Росы. Перазахаваньне адбылося 18 лістапада 1989 года. Удзельнічала шмат людзей з нацыянальнымі сьцягамі, многа кветак і сьвечак. Імшу адслужыў ксёндз Тунайціс, пазьней прызначаны біскупам. На магіле быў пастаўлены драўляны крыж. Праз тры гады на месца крыжа пастаўлены прыгожы помнік работы віленскага скульптара - беларуса Эдуарда Падбярэзкага.

Напачатку 1990 года была заснавана пры 37-ай сярэдняй школе Беларуская нядзельная школка, якой кіравала Альдона Папова. Прыхільна адносіўся да беларускай справы дырэктар школы К. Машара.

18 студзеня 1990 года выйшаў першы нумар беларускай старонкі “Пагоня” ў літоўскай газэце “Летувос рытас”, якую падрыхтаваў Аляксей Анішчык.

У тым часе адбываліся перамовы з праваслаўным епіскапам Антоніем наконт службы па-беларуску ў Пятніцкай царкве. Справа вырашалася станоўча, але епіскапа тэрмінова перавялі ўглыб Расеі і пытаньне закрылася.

Ішло актыўнае наладжваньне культурных і дзелавых сувязяў з беларусамі блізкага і далёкага замежжа. Мая паездка ў Канаду і ЗША ў 1989 годзе па запрашэньню маіх сёстраў спрыяла гэтаму.

Запамяталася сьвяткаваньне 150 гадоў нараджэньня Францішка Багушэвіча ў Кушлянах і знаёмства са шчырымі беларусамі з Ашмян - настаўнікам Пятром Лагуновічам і яго жонкай Зінаідай. Ён і яго сямья шмат пацярпелі ад савецкай улады і партызанаў. На жаль, абое ўжо памерлі, не дачакаўшы лепшай долі і пашаны.

У канцы жніўня адбылася сустрэча ў Базыльянскіх мурах адзінаццаці ўдзельнікаў звышмарафону з Беларусі (бегуноў на 800 кілямэтраў ) на чале з Алесем Мікалайчанкам. Госьці далі вялікую канцэртную праграму, выступілі Алесь Камоцкі, У. Варачаеў, Г. Дзягілева, гурт “Лявоны”. Мы падаравалі ім сярод іншага эмблему “Пагоні”.

А 17 лістапада афіцыйнае адкрыцьцё мэмарыяльнай таблíцы Францішку Скарыну на вуліцы Вялікай. Выступалі ксёндз Уладзіслаў Чарняўскі, Станіслаў Шушкевіч, міністар культуры Літвы Дарыюс Куоліс. Адбылася служба ў Катэдральным саборы. Вечарам банкет у рэстаране “Паланга”, які ладзіла ТБК.

У канцы 90-га года я і Лявон Луцкевіч сустрэліся з рэктарам падінстытута спадаром Размам. На сустрэчы абмяркоўвалася пытаньне аб адкрыцьці на факультэце славістыкі катэдры беларускай мовы і літаратуры, аналагічна польскай, якая ўжо існавала. Пазьней пытаньне вырашылася станоўча. Першай загадчыцай стала Тацьцяна Каротчанкава.

З нагоды 40 дзён ад путчу ў Літве ў 1991 годзе з Беларусі прыехалі тры поўныя аўтобусы дэпутатаў і прадстаўнікоў інтэлігенцыі, каб ушанаваць памяць загінуўшых і ўскласьці кветкі на магілы абаронцаў. У Сойме Літоўскай рэспублікі, які нагадваў абарончую крэпасьць, выступалі з прамовамі Ландзбергіз, Антончык, Грумадас, Гюнтэр, Хадыка і другія. Госьці з Беларусі агледзелі горад і месцы баёў каля Камітэта і вежы тэлебачаньня.

У сярэдзіне сакавіка 1991 года адбылася сустрэча з бацькамі другіх-чацьвёртых клясаў 32 сярэдняй школы, дзе стваралася беларуская кляса пад кіраўніцтвам Марыі Матусевіч. Да гэтага прыхільна адносіўся дырэктар школы спадар Вараб`ёў.

18 траўня 1991 года адбылося перазахаваньне ўрны з астанкамі Івана Луцкевіча на могілках Росы, якую прывезьлі з Закапанага з Польшчы Юры і Алег Латышонкі. Прысутнічала каля трохсот чалавек. Выступалі З. Пазьняк, М. Ткачоў, Ю. Хадыка, А. Сідарэвіч, А. Латышонак. ТБК наладзіў вячэру ў рэстаране “Паланга”, у памешканьні, дзе некалі жыў Іван Луцкевіч. Праз два гады на могілках Росы быў пастаўлены мармуровы помнік Івану і Антону Луцкевічам, які за сімбалічна нізкую плату выканаў скульптар з Менску Алесь Мірончык. Адкрыцьцё помніка Івану і Антону Луцкевічам прымеркавалі да Дня Волі і прайшло гэта вельмі ўрачыста. Выступалі айцец Аляксандр Надсан, Язэп Сажыч, Юры Хадыка, Мікола Чарняўскі, Леанід Акудовіч, В. Алюліс, Данчык. Вечарам Таварыста наладзіла банкет для гасьцей на 80 чалавек. Прысутнічаў мэр гораду Ясулайціс.

У жніўні 1991 года арганізавалі паездку на сваіх машынах у Ракуцёўшчыну на сьвяткаваньне гадавіны Максіма Багдановіча. Агледзелі музэй Багдановіча і паслухалі вялікі канцэрт на адкрытай сцэне. Затым наведалі жонку і дачку Браніслава Тарашкевіча.

Востра стаяла пытаньне аб памешканьні для ТБК. Аказалася, што пры актыўнай дзейнасьці ў Вільні беларускіх арганізацый у міжваенны перыяд, значнага інтэлектуальнага іх патэнцыялу, яны не мелі ніякіх сваіх памешканьняў. Гэта ўскладняла вырашэньне пытаньня аб вяртаньні нам маёмасьці. Я вырашыў паспрабаваць узгадаць пра дамкі, якія належалі беларусам - айцам-марыянам з Друі. Пачаўся цярністы шлях па розных інстанцыях уладаў Літвы. На жаль, у гэтым пытаньні мяне ніхто не падтрымліваў сярод сваіх беларусаў. Не верылі, што можна чагосьці дабіцца. Тым не менш, у рэшце рэшт гэтую праблему ўдалося вырашыць і на сёньняшні дзень займаем цэлы будынак. Стан памешканьняў быў дрэнны, трэба было рабіць рамонт: мяняць прагніўшую падлогу, усю сантэхніку, электраправодку, мяняць планіроўку. У памешканьнях не было ніякой мэблі. Ад метраполіі Беларусі не атрымлівалі ніякой дапамогі, хутчэй сымбалічнай была дапамога з боку Літвы. Можна зразумець, як нялёгка было ўсё гэта вырашыць. Сёньня і сам зьдзіўляюся. Затое мы ўжо не толькі маглі тут працаваць, праводзіць свае мерапрыемствы, але і дапамагаць другім. Напрыклад, на працягу чатырох гадоў мы без усялякай аплаты за памешканьне і камунальныя паслугі дазволілі карыстацца часткай памешканьняў рэдакцыі “Нашай нівы”. Бясплатна карысталіся

нашымі памешканьнямі і другія беларускія патрыёты, што прыехалі жыць альбо працаваць у Вільню. Радуе, што як памяць аб сабе пакіну Таварысту Беларускай Культуры магчымасьць працаваць і развівацца ўсваім памешканьні.

Дзень Волі 1992 году праходзіў у Літоўскім акадэмічным тэатры. Заля была запоўнена. Зводны аркестр "Трымітас" выканаў гімн "Мы выйдзем шчыльнымі радамі". З прамовамі выступілі Вітаўтас Ландзбергіс, Станіслаў Шушкевіч і Лявон Луцкевіч. Менскі тэатр Янкі Купалы паказаў пьесу "Тутэйшыя". ТБК арганізавала банкет для высокіх гасьцей. Прысутнічаў шэраг відных дзеячоў Саюдзіса і Беларусі.

У сьнежні 1992 года ў Менску праводзілася сустрэча беларусаў блізкага замежжа. Ад Літвы прысутнічала каля 30 чалавек. Выступалі С. Шушкевіч, З. Пазьняк, Л. Луцкевіч, Х. Нюнька і другія. На заканчэньне з добрым рэпертуарам слухалі хор пад кіраўніцтвам Міхася Дрынеўскага.

У студзені 1993 года створаны філіял ТБК з 20 чалавек у Друскеніках. Кіраўніком суполкі стаў Іван Ломаць. У філіяле дзейнічае выдатны дзіцячы хор. Філіял аказваў фінансавую дамамогу ТБК.

З 5 да 10 ліпеня адбыўся ў Менску ў тэатры оперы і балета Першы Зьезд беларусаў сьвету - вельмі значная падзея. Удзельнічала 1200 дэлегатаў. Адкрыў Зьезд прэзідэнт "Бацькаўшчыны" В. Быкаў. Выступалі: С. Шушкевіч, М. Дзямчук, Я. Лецка, З. Пазьняк, М. Статкевіч і другія. Прынята было шэраг палітычных заяў і дэкляарацый.

Першы Зьезд беларусаў сьвету з Эўропы, Амэрыкі, Канады і Аўстраліі ўвойдзе зорнай старонкай у гісторыю Беларусі. Праз чатыры гады ў Менску проўдзе Другі Зьезд беларусаў сьвету. На гэты раз антыбеларускі рэжым зрабіў усё, каб Зьезд праваліць. Каб падзяліць беларусаў на два варожых лягеры. Да апошняй хвіліны чынілі перашкоды з памешканьнем, хаця заля ў тэатры была заранёў аплочана. Правакатары і эмісары ад улады запрашалі на ўдзел у альтэрнатыўным сходзе, дзе выступілі супраць Згуртаваньня беларусаў сьвету "Бацькаўшчына", за яе ліквідацыю. Частка гасьцей, у тым ліку і з Літвы, здрадзілі і пайшлі на сустрэчу з Лукашэнкам. За гэта кожны з іх атрымаў гадзіньнік і "трыццаць сярэбранікаў". Другі Зьезд беларусаў сьвету ўвойдзе ў гісторыю як акт падзелу і здрады ў беларускім грамадстве.

Летам 1993 года абмяркоўвалася пытаньне беларускай школы ў Сойме Літоўскай Рэспублікі, міністэрстве адукацыі Літвы, гарадскім аддзеле адукацыі і нават у прэзідэнта. З 1 верасьня 1993 года адчынена першая беларуская школа пры 17-ай рускай школе. Нарэшце 1 верасьня 1994 года адкрыта беларуская школа ў асобным будынку былога дзіцячага садка па вуліцы Сеціно, 21. Канешне, трэба было даць нам пад школу лепшы будынак у цэнтры горада, але і гэта была перамога. Дырэктарам была прызначана па маёй прапанове Галіна Сівалава. Было спадзяваньне, што новая школа пяройме традыцыі Віленскай беларускай гімназіі, аднак у далейшым прадстаўнікі лукашэнкаўскага рэжыму падкупілі і ўзялі пад свой кантроль кіраўніцтва і працу школы. З 1999 году кантакт школы з Таварыствам Беларускай Культуры спыніўся.

Напрыканцы 1993 года Лявон Луцкевіч разам са мною паднялі пытаньне перад амбасадарам Рэспублікі Беларусь У. Шчасным аб куплі кватэры Пётра Сергіевіча па вуліцы Антакальню, 30А, у якім мастак пражываў сорак гадоў, каб там стварыць музэй-кватэру Пётра Сергіевіча, што ён, як таленавіты мастак і

патрыёт Беларусі, заслужыў. Спадар Шчасны аднёсься станоўча і пасьля ўзгадненьня з цэнтрам пачалося канкрэтнае вырашэньне пытаньня. Спачатку выкупілі частку кватэры, якую займала чужая асоба і мела асобны ордэр. Даглядаць хворую жонку П. Сергіевіча ТБК прызначыў свайго сябра. Заставалася выкупіць другую частку кватэры, каб давесьці справу да канца. Стварэньне кватэры-музэю з гарадской мэрыяй было ўзгоднена. На жаль, новы пасол РБ Я. Вайтовіч не змог ці не захацеў вырашыць канчаткова справу і кватэра Сергіевіча была прададзена для камэрцыйнай структуры. Глыбока перажываў гэта сябра Сергіевіча Лявон Луцкевіч, за такія абыкавыя адносіны беларускіх уладаў да нашых нацыянальных каштоўнасьцяў. Усяго, што ўдалося дабіцца ТБК, дык гэта атрымаць дазвол і ў 1996 годзе замацаваць на фасадзе будынку прыгожую бронзавую мэмарыяльную табліцу скульптара Фёдара Іванчанкі.

5 лістапада 1993 года выйшаў першы нумар штотыднёвай старонкі “Беларус Віленшчыны” ў газэце “Эхо Литвы”. Рэдакцыя ў складзе Лявона Луцкевіча, Леваніда Караля і Хведара Нюнькі. Старонка выходзіла без перапынку да пачатку 1995 года. Усяго 62 нумары. З верасьня 1994 года “Беларус Віленшчыны” друкаваўся таксама ў польскай газэце “Кур`ер Віленскі”. Усяго 32 нумары. Выпуск старонкі прыпыніўся, калі рэдакцыі газэтаў патрабавалі дадатковай аплаты, а такой магчымасьці ў нас не было.

У жніўні 1994 года адбыўся першы З`езд беларусаў Балтыі. На адкрыцьці ў залі музычнай школы імя Чурлёніса прысутнічала каля 150 чалавек. Прыехалі прадстаўнікі з Эстоніі, Латвіі, Беларусі і Літвы. У той жа дзень была адкрыта мемарыяльная табліца Янку Купалу па вуліцы Віленскай. Развітальную вячэру ў кафэ “Кемяліс” фінансаваў міністр культуры Літвы Д. Трынкунас.

Праз чатыры гады ў Базыльянскіх мурах Вільні ў залі былой Віленскай беларускай гімназіі пройдзе Другі Зьезд беларусаў Балтыі. Беларуская грамадзкасьць ужо будзе падзелена на “чэсных” і “нячэсных”. Суполкі з Літвы, што ў свой часу здрадзілі Згуртаваньню беларусаў сьвету “Бацькаўшчына”, пад надуманым пратэкстам і ўказам з Менску абьявілі байкот зьезду. Зачыталі правакацыйную заяву з мэтай раскалоць зьезд. Да гонару дэлегатаў Другога зьезду Балтыі, ніхто на правакацыю не паддаўся. Зьезд да канца прайшоў на добрым узроўні, прыняўшы важныя рашэньні і заявы.

У лістападзе 1994 адбылося ўрачыстае адкрыцьцё помніка дзеячу беларускай культуры і былому вязьню сталінскіх лягероў Паўлу Карузу. Сьвятар Уладзімір адслужыў паніхіду і асьвяціў помнік. Пасол Я. Вайтовіч усклаў вянок. Аўтар помніка Эдуард Падбярэзкі. У тым жа месяцы адбылося адкрыцьцё мэмарыяльнай табліцы віднаму навукоўцу і грамадскаму дзеячу, ахвяры сталінізму, Браніславу Тарашкевічу работы скульптара А. Мірончыка. Выступалі Ганна Сурмач і Васіль Быкаў.

У сьнежні 1994 па ініцыятыве ТБК адбылася сустрэча кіраўнікоў усіх беларускіх суполак у Літве з мэтай каардынацыі іх дзейнасьці. Вырашана было праводзіць сустрэчы кожны месяц. Такая ініцыятыва была падтрымана паслом Уладзімірам Шчасным. Прайшло некалькі сустрэч. Пазьней, у сувязі з пераменамі ў нацыянальнай палітыцы Беларусі, сустрэчы суполак у ТБК прыпыніліся.

У кастрычніку 1995 адбылося адкрыцьцё помніка з паніхідай Зоі Коўш на Ліпаўскіх могілках. Як бацька Аляксандр Коўш, так і дачка Зоя былі адданымі патрыётамі Беларусі. За гэта айцец Аляксандр быў растраляны немцамі, а Зоя

шмат гадоў працярпела ў сталінскіх лягерох. Пры жыцьці Зоя, застаўшыся адна, прасіла Лявона Луцкевіча прызначыць надзейнага чалавека даглядаць яе. За гэта ён атрымаў бы ў спадчыну яе дом па вуліцы Васарос. Мы з Лявонам абмяркоўвалі гэтае пытаньне і парэкамендавалі Сяргея Шупу, які пераязджаў у Вільню і ня меў кватэры. Тым больш, яго багатыя веды маглі шмат дапамагчы ў рабоце ТБК. А стары чалавек Зоя Коўш - мець надзейную падтрымку і догляд. На жаль, так не атрымалася і гэта было нашай памылкай.

У лістападзе 1996 ў залі гатэля “Летува” праходзіла канфэрэнцыя міжнароднай Гэльсінскай Федэрацыі па правах чалавека. Прысутнічалі прадстаўнікі з 25 краін. З-за адсутнасьцю беларускага прадстаўніка я ўзьняў пытаньне аб парушэньні рэжымам правоў чалавека ў Беларусі. Дэлегаты абяцалі, што пасля Вільні яны паедуць у Менск, дзе будзе прынята адмысловая заява. Пазьней адбыўся наш пікет пратэсту перад Расейскай амбасадай супраць падтрымкі Расеяй рэжыму Лукашэнкі. Выступалі Х. Нюнька, Я. Станкевіч, В. Савянкоў, Л. Кароль, А. Анішчык, А. Старавойтаў. Амбасадзе быў перададзены наш пратэст.

У лютым 1997 году паседжаньне ініцыятыўнай групы наконт выданьня беларускай газэты. Выбрана рэдкалегія ў складзе Т. Шмідт - рэдактар, Л. Кароль, С. Вітушка, І. Бэйнар, А. Старавойтаў, А. Аблажэй, П. Саўчанка. Першы нумар “Руні” выйшаў у сакавіку 1997 года. З дзесятага нумару “Руні” рэдактарам стаў А. Мінкін. Паступова выданьне газэты адыйшло ад ТБК да Цэнтра грамадскіх ініцыятыў, які цяпер зьяўляецца выдаўцом газэты.

26 красавіка 1997 на гарадской плошчы адбыўся мітынг ТБК з нагоды Чарнобыльскай аварыі і становішча на Беларусі. З прамовамі выступілі Х. Нюнька, Л. Кароль, Л. Мілаш, А. Анішчык, Т. Шмідт, А. Мінкін, Я. Станкевіч, С. Вітушка і А. Старавойтаў.

5-6 ліпеня 1997 года ў Вільні ў канфэрэнц-залі гатэля “Летува” адбылася сэсія Эўрапейскага сэктару Беларускай Народнай Рэспублікі. Мне было даручана тэхнічная арганізацыя з`езду. Прысутнічалі прадстаўнікі Польшчы, Эстоніі, Канады, Бэльгіі, Расеі, Амэрыкі, Германіі, Чэхіі, Беларусі і Літвы. Канфэрэнцыя прайшла на добрым узроўні. Мой уклад высока ацэнены: я атрымаў прэмію 200 даляраў. Напрыканцы жніўня я быў запрошаны на сэсію Рады БНР у Нью-Ёрк. Пасьля багаслужбы ў царкве Жыровіцкай Божай Маці пачалося абмеркаваньне працы Рады БНР, затым ушанаваньне памерлых сяброў Рады, прысяга новых сяброў, выбары камісіі і Прэзідыюма. Івонка Сурвіла выбрана старшынёю Рады. Мяне выбралі ў Прэзідыюм Рады БНР. На сэсіі былі прыняты звароты і мэмарандум да сусветнай грамадскасьці.

30 ліпеня 1997 года мы назаўсёды развіталіся з Лявонам Луцкевічам. Пахавалі выдатнага чалавека, змагара за свабоду і незалежнасьць Беларусі, ініцыятара стварэньня Таварыства Беларускай Культуры. Вялікі яго ўклад у дзейнасьць ТБК. Не было ні аднаго пытаньня, каб вырашалася без яго ўдзелу. Мы былі заўсёды аднадумцы і разам спадзяваліся дачакацца свабоднай Беларусі. На жаль, лёс распарадзіўся па-іншаму. Я зрабіў усё, што мог, каб ушанаваць яго памяць на могілках Росы.

1 кастрычніка 1997 года на 95-годзе жыцьця памёр мой бацька Якуб Нюнька. Ён не быў ні вучоным, ні грамадскім дзеячом, але ўсё жыцьцё быў сумленным работнікам, не цураўся ніякой працы. Быў, як кажуць, майстра на ўсе рукі. Руплівы і

верны бацька і муж. Таму і ў самыя складаныя часы мы не ведалі ні голаду, ні холаду. Як рукатворны помнік па сабе, пакінуў нам прыгожа аздобленую дачу, якую афармляў, маючы ўжо пад 80 гадоў. Вечная табе памяць, баця!

3 лістапада 1997 года адзначыўся неаднолькавы падыход у беларускіх арганізацыяў Літвы да падзей на Бацькаўшчыне. Зварот ТБК да ўладаў Беларусі і міжнароднай супольнасьці супроць утрыманьня ў ізалятары і суда над патрыётамі Уладзімірам Лабковічам і Аляксеем Шыдлоўскім адмовіліся падпісаць Згуртаваньне беларускіх арганізацыяў (Л. Мурашка), суполкі ў Вісагінасе, Салечніках і Сьвянцянах. У далейшым гэтыя суполкі ні разу не выказалі свайго пратэсту супроць таго беззаконьня, што творыцца на Беларусі. Не ўдзельнічалі ні ў адной акцыі пратэсту. Затое цесна пачалі супрацоўнічаць з адміністрацыяй Лукашэнкі, думаю, што не бескарысна. Таму нашы пазыцыі канчаткова разышліся. Таварыства Беларускай Культуры адмовілася ад матэрыяльных падачак, якія суліў антыбеларускі рэжым за здраду нацыянальнай ідэі. Кантакты нашыя з падпарадкаванымі амбасадзе РБ суполкамі сталі вельмі абмежаванымі.

24 красавіка 1999 група сяброў ТБК В. Саковіч, Н. Брылеўская, Л. Мілаш, Т. Шмідт і я паехалі ў Ліду, каб наведаць рэдацыю "Нашага слова" - рэдактар Станіслаў Суднік. Адначасова хацелі высьветліць месца пахаваньня Юльяна Саковіча, забітага бандытамі ў 1943 годзе. Пазнаёміліся з Ліліяй Сазанавец, каб надалей разам супрацоўнічаць. Па прычыне дрэннай працы памежнікаў вярнуліся ў Вільню толькі ноччу.

Неяк прачытаў у газэце "Каўно дзіена" артыкул прафэсара Гензяліса "Данілеўскі і Расея" пра панславянскія пляны імпэрыі. Беларусь, па словах Гензяліса, ня мела сваёй дзяржаўнасьці. "Крытыкуем палітыку Лукашэнкі, а хто яго апанэнты,- гаворыць прафэсар, - гэта дэмакраты, якія мрояць аб вялікай Беларусі, у якую ўвойдзе большая частка Літвы, Смаленск, Пскоў і другія. Так што трэба гэта ўлічваць пры правядзеньні нашай зьнешняй палітыкі". Вось так заяўляе аўтарытэтная асоба, доктар навук, былы старшыня соймавай камісіі В. Гензяліс.

10 ліпеня 1999 года адзначылі юбілей дзесяцігодзьдзя існаваньня ТБК. Імпрэза прайшла ў залі Таварыства. Прысутнічалі С. Шарэцкі, Р. Озалас, З. Пазьняк, Р. Мотузас, Г. Бураўкін, А. Грыцкевіч, С. Каўшыніс. Юбілей прайшоў на добрым узроўні.

14 ліпеня ўшанавалі памяць лепшага майго сябра, намесьніка і памочніка Леваніда Караля. На гадавіну яго сьмерці адкрылі помнік на Ліпаўскіх могілках, выкананы на сабраныя сродкі сяброў скульптарам Эдуардам Падбярэзкім. Уклад у нашу працу Лявона Караля немагчыма пераацаніць. Ён самаахвярна выконваў любое заданьне, ніколі не падвёў. Страта для ТБК велізарная. Да гэтай пары няма яму замены. Вечная памяць Табе, дарагі дружа!

21 ліпеня 1999 года адбыўся пікет перад амбасадай Рэспублікі Беларусь. Прысутнічала 25 чалавек з нацыянальнымі сцягамі і плякатамі. Вечарам пра гэта паказалі ўсе каналы літоўскага тэлебачаньня. Былі паведамленьні ў друку. Пасольству Рэспублікі Беларусь і прахожым давалі заявы аб заканчэньні кадэнцыі прэзідэнта Аляксандра Лукашэнкі. Такі зварот быў уручаны ураду, Сойму Літвы і прэзідэнту В. Адамкусу.

22 ліпеня 1999 года прыехалі з Менску дэпутаты Вярхоўнага Савета Сямён Шарэцкі і Станіслаў Шушкевіч. Апошні вярнуўся ў Беларусь, а Сямён Шарэцкі застаўся ў Вільні, каб тут у больш бясьпечных умовах, чым гэта было ў Беларусі,

прадоўжыць сваю працу. ТБК аднеслася да гэтага з разуменьнем і аказала С. Шарэцкаму ўсю магчымую падтрымку і дапамогу. Па сёньняшні дзень плённа ідзе наша супрацоўніцтва, тым больш, што нашы погляды як на становішча ў Беларусі, так і на неабходнасьць вяртаньня Беларусі да свабоды і дэмакратыі супадаюць. ТБК лічыць сваім абавязкам дапамагаць Вярхоўнаму Савету Беларусі ў гэтай высакароднай справе. За час знаходжаньня кіраўніцтва Вярхоўнага Савета ў Літве мне давялося ўдзельнічаць на прыёмах ва ўсіх замежных амбасадах, якія маюць свае прадстаўніцтвы ў Літве. Меў гонар удзельнічаць разам са спадаром С. Шарэцкім у замежных сустрэчах на высокім узроўні кіраўніцтва Польшчы, Украіны, Эстоніі і Амэрыкі.

На пачатку сьнежня 1999 года прыехаў у Вільню Генеральны пракурор РБ Рыгор Пракаповіч.

25 сакавіка 2000 адзначылі Дзень Волі ў ТБК. Прысутнічалі і выступалі ад Літвы:З. Яцкунас (Сойм Літоўскай Рэспублікі), С. Каўшыніс, К. Шышэя, Р. Мотузас, П. Саўчанка, ад Беларусі: А. Грыцкевіч і Р. Гарэцкі. Гірлянда кветак падаравана ад Спікера Сойму В. Ландзбергіса. Наладжаны быў сьвяточны стол.

З 12 па 15 чэрвеня адбыўся ў Сойме Літоўскай Рэспублікі Міжнародны Кангрэс па ацэнцы злачынстваў камунізму. Прысутнічалі прадстаўнікі з 23 краін. Ад Беларусі ўдзельнічалі і выступалі 7 чалавек. З іх выступамі выдадзеная брашура на беларускай мове.

28-29 ліпеня ў Менску прайшоў Усебеларускі Зьезд у абарону незалежнасьці і суверэнітэту. Прысутнічала 1350 дэлегатаў. Ад Літвы былі запрошаны С. Печалюнас, М. Іголка і Х. Нюнька.

27 жніўня адбылася экскурсія на аўтобусе па месцах Францішка Багушэвіча. Наведалі Рукойні, Сьвіраны, Кушляны, Жупраны, Крэва, Баруны. Удзел узяла 13 чалавек. Зьнята відэастужка.

З 29 жніўня па запрашэньню Рады БНР знаходзіўся ў Кліўлендзе (ЗША). Сэсія Рады БНР і Зьезд беларусаў Паўночнай Амэрыкі праходзілі ў прыгожым будынку “Полацак” і новай царкве. Уразіла, як шмат зрабілі беларусы, і ў першую чаргу С. Карніловіч і К. Калоша, дзеля ўмацаваньня нашай эміграцыі ў далёкай Амэрыцы. Заадно наведаў сваіх сёстраў у Канадзе (Таронта і Гамільтон). Усё ўбачанае надоўга застанецца ў маёй памяці.

Падсумоўваючы свае ўспаміны, асабліва за апошнія 12 гадоў, трэба нагадаць пра асноўны напрамак дзейнасьці ТБК. Выдадзена 6 кніг, устаноўлена 6 помнікаў і 7 мэмарыяльных табліц, наладжваліся шматлікія пікеты і рабіліся заявы пратэсту. Адбылося безьліч сустрэч з літоўскімі ўладамі на ўсіх узроўнях. Шмат часу займае пошук мінімальных сродкаў для існаваньня ТБК.

На жаль, праблема адраджэньня ці стварэньня музэяў Івана Луцкевіча, Якуба Коласа і Пётра Сергіевіча пакуль не зрушыліся з месца. Усе нашыя намаганьні не прынесьлі плёну.

Перада мною і маімі аднадумцамі Лявонам Луцкевічам, Леванідам Каралём, Кастусём Шышэям і другімі стаяла адна мэта - усе свае сілы, веды і магчымасьці аддаць справе Свабоды і Незалежнасьці нашай Беларусі дзеля памяці тых, што пайшлі паміраць, каб жыла Бацькаўшчына. Гэтай ідэі верна і самаахвярна служылі да канца жыцьця Лявон Луцкевіч і Леванід Кароль. А той, хто застаўся жыць, будзе надалей змагацца, бо верыць, што “Ночка цёмная на сьвеце вечна не пануе, зерня, кінута ў ніву, усходзе ды красуе”.